И перед клубом стоит задача, заняться развитием женщины, не только работницы, которая уже в настоящее время не уступает, часто по развитию мужчине, но более отсталой женщины—жены рабочего.

Для этой цели ее необходимо привлечь в клуб, постараться вырвать ее из заколдованного семейного круга, где она часто не имеет ни минуты отдыха—дать ей этот отдых и развлечения в клубе.

И в то же время, путем лекций и бесед, расширять ее кругозор, чтоб у нее не могло быть сомнения на чьей стороне ее симпатии.

Надо поставить в клубе работу так, чтобы женщина на все возникающие у нее вопросы получала все ответы в клубе, а не шла за разрешением своих сомнений к соседке. Она не должна чувствовать себя в клубе гостьей, в чужом доме или ученицей в школе. Необходимо заинтересовать ее, заставить ее полюбить этот клуб, сделать ее в нем активной работницей.

Прежде всего необходимо участие женщины в работе правления клуба, куда следует выбирать женщин активных, могущих принести пользу делу. Необходимо самое широкое вовлечение женщин в организуемые при клубе кружки. В профполиткружках, кружках по ликвидации неграмотности, они будут приобретать знания, а участвуя в кружках хоров., музыкальн. и живой газете, будут находить здоровое развлечение и отдых. В библиотеке-читальне женщина должна найти интересующие ее книги и журналы, как, например: сочинение Крупской, Клары Цеткин, журнал „Работніца і Сялянка“ и др.

При участии женщины, в клубе мог быть сорганизован кружок кройки и шитья и, думается, что женщины охотно бы в них участвовали. В стенной газете также должна участвовать женщина. В своих статьях она должна осветить все стороны быта и свою работу в клубе.

Для того, чтобы женщина, как работница, так и жена рабочего могли, в свободное от работы время, отдаться интересующей их общественной работе, необходимо организовать при каждом клубе детские комнаты, куда бы матери могли приводить своих детей, которых не на кого оставить дома и быть спокойными, что за детьми не только присмотрят, но и доставят им разумное развлечение.

**Л. Жилина.**

Занятия с делегатками на фабр. „Красная Березина“.

# НА ФАБРИКЕ „ДВИНЕ“

## В чесальном цехе.

Брошенный нашей партией и советской властью клич о поднятии производительности труда нашел отклик у наших работниц. Вот цифры, ярко говорящие об этом: в январе 23 года выработано 5074 пуда льна, а в январе 25 года, при том же количестве рабочих, выработано 8488 пудов.

В производственных совещаниях работницы принимают самое активное участие, указывая на недостатки, которые необходимо исправить. Нет больше прежнего небрежного отношения к продукции. Работница поняла, что от качества товара, от поднятия производительности труда зависит улучшение ее материального положения.



В чесальном цехе.

Далеко ушли мы за эти годы и в культурном отношении. В нашем цехе 83 работницы и из них за последние год—полтора в партию вступило 8 человек и в комсомол 14. Еще характерным моментом роста сознательности работниц надо отметить заявления целого ряда работниц, из‘явивших желание быть

Детский сад.

делегатками. С каждым днем растет количество работниц-общественниц. Сейчас их свыше 60%

Не забываем мы и различные общества. В МОПР‘е состоят все работницы.

С каждым днем растет любовь работниц к своему родному журналу „Беларуская работніца і сялянка“. На 83 работницы у нас выписывается 38 журналов.

Работница **Танская.**

## Детский сад при фабрике „Двина“.

В $6\frac{1}{2}$ часов раздается гудок на фабрике, а ему подпевают звонкие детские голоса. Это дети рабочих спешат в свой детский сад, где тепло, светло и уютно, где можно найти полное удовлетворение всем своим детским интересам. Вот их „трудовой день“:

Придя в детский сад, они стирают пыль со столов и стульчиков, поливают цветы, кормят кроликов, кошку. В 8 час пьют чай. После чая начинаются игры, пение, лепка, рисование, беседы. Старших детей учат грамоте. В хорошую погоду летом занятия производятся исключительно на свежем воздухе. Зимой дети ходят гулять. В час дня обедают, а затем отдыхают. После отдыха дежурные дети вместе с воспитательницей убирают спальни. Остальные играют. В 4 часа начинают расходиться по домам.

Коллектив сада ставит своей задачей воспитать детей так, чтобы они выросли истинными борцами за коммунизм, развить в них общественно-коллективные наклонности и навыки, любовь к труду. Дети знакомятся с жизнью вождей революции и революционными событиями в живой и легкой. форме, доступной детям. Ведутся беседы и рассказы, что очень живо интересует детей и ярко отражается в детских работах. Три раза в неделю детский сад посещает звено пионеров, которые вносят струю новой жизни.

Всех детей в саду 35 человек, в возрасте от 3 до 7 лет. Обслуживающего персонала 4 человека. Управлением фабрики „Двина“ отведено очень хорошее помещение. Весь нужный ремонт выполняется фабрикой. Питание для детей и содержание персонала оплачивается Наробразом.

**Коллектив детсада.**

## Наши активистки.

Было время и совсем недавно, когда из 532 работниц ф-ки „Двина“, при всех выборах у нас имелось только две „забронированных“ работницы. Теперь-же к этому числу мы можем прибавить уже не мало активисток. Возьмем Ирину Пещенкову, которая на ф-ке „Двина“ работает 24 года непрерывно и все в чесальном отделении.

Совещание организаторов по работе среди женщин союза текстильщиков.

В 1923 году у Иринушки появляется желание стать сознательной, несмотря на свои 45 лет, она добровольно поступает в ликпункт и ликвидирует свою неграмотность, а в годовщину смерти Ильича мы видим ее в рядах РКП. В настоящее время она член Ф-кома и Кассы Взаимопомощи, делегатка, одна из активных рабкорок. Всегда весела и шутлива, наша Иринушка всегда за работой, а рядом с ней станок со станком— Мария Танская на ф-ке „Двина“ с 1921 года. В первый Ленинский призыв записывается в партию и начинает усердно ликвидировать свою неграмотность. Она и теперь не перестает учиться и переходит во вторую группу вечерней школы. В данный момент, она член Бюро Коллектива, организатор среди женщин, одна из наилучших секретарей цех'ячейки.

Вот Елена Марусевич работница ф-ки „Двина“ с 1915 года. После смерти Ильича первая попадает в список о вступлении в партию. В июле 1925 года она отзывается на женотделовскую работу в пролетарский район Маркувщина.

Да, теперь мы можем сказать работницам всего мира, что тот угол, который раньше был полон невежества, сейчас просветляется. Он сумеет отстоять в нужную минуту завоевания Октябрьской революции. Этим еще далеко не исчерпывается наш актив, но не обо всех сразу.

Работница ф-ки „Двина“
**Соня Бескина.**

## Больше посуду не бьем.

У нас при Союзе Нарпит имеется организатор среди работниц. Работа проделывается большая. Часто бывают собрания, большинство втянуты в кружки. Есть при месткоме библиотека, которой пользуются работницы. Посредством производственных совещаний улучшена работа и в столовых, поднята производительность. Были времена, когда работницы были враждебны друг к другу. Много билось посуды. Отрабатывая свое время, работницы не смотрели, что столы грязные и посуда не домыта, бросали работу и уходили. А сейчас каждая понимает, что улучшая работу на предприятиях, тем самым улучшается быт рабочего.

С каждым днем чувствуется победа над врагом—безграмотностью. Наши ликпункты, наши вечерние общеобразовательные школы переполнены.

**А. Городник.**

## О чем думает жена рабочего.

Она думает: как бы ей поучиться, несмотря ни на какие трудности. И вот, благодаря этой тяге, большинство неграмотных в союзе деревообделочников ликвидировали свою неграмотность.

А сколько трудов это стоило им! Сколько было препятствий! То не на кого оставить детей, то дети больные. И все-же это их не останавливало. Иногда муж придет с работы, а дети плачут. Отец спрашивает: „где мать“ и слышит: „ушла в школу“. Когда-же приходит жена, муж начинает упрекать: „Почему ты бросаешь детей? Тебе школа дороже?“ В большинстве мужья не хотят оставаться с детьми и заявляют: „если хочешь учиться бери с собой детей“. Но и это не останавливает теперь женщин. Они поняли теперь, как плохо быть неграмотным. Учительницы, которые учат нас, говорят нам, что мы придем к коммунизму только тогда, когда все женщины будут грамотными и сознательными, наравне с мужчинами.

Мы все выдержали экзамены. А чего это стоило! Берешь книгу, хочешь учиться—в печке горшок бежит, ребенок плачет, дети пришли из школы, муж с работы—надо дать пообедать. Зимний день короток. Оглянуться не успеешь, надо об ужине подумать. А сама хоть ночью учись. Да так и было, но мы все-таки учились и видим теперь, что трудом и наукой можно победить все.

**Разумовская.**

**От редакции.** Тов. Разумовская затронула больной для работниц и жен рабочих вопрос. Учиться работнице трудно. Только общественное питание может немного раскрепостить женщину от кухни. Очень помогут вечерние ясли. При некоторых фабриках они уже организуются. При клубе или по близости от клуба отводится комната. Мать, идя в школу или в клуб, забирает с собой детей и пока она занята, дети остаются там. Это в значительной степени поможет работницам уделять больше времени своему развитию.

## Сын научил мать.

28 лет верила я в бога и была уверена, что выше бога нет ничего на свете.

Но этой вере пришел конец.

И кто-бы, вы думали помог мне?—Сын. Мой маленький сынишка. Еще в 24 году приходит он как то из школы и с радостью заявляет:

— Мама! поздравь меня. Я вошел в ряды пионеров.

— А в церковь ходить будешь? Богу молиться будешь?—спрашиваю я.

— Зачем, мама? разве что либо дает нам бог? нам надо лучше читать книги. С книгами мы скорее дойдем до хорошей светлой жизни, чем с богом.

Запали эти слова сына в мою голову. Стала я читать политические книги. Стала мало-по-малу разбираться во всем. Потом стала ходить на женские собрания, собрания ячейки, стала принимать активное участие в общественной работе. А сейчас я—член партии.

И смешно мне иногда бывает: маленький сынишка перевоспитал большую мать.

А мы еще ругаем пионеров. Не ругат их должны мы, а посылать туда своих детей.

**Б. Шульман.**

## Как втянули в работу жен кустарей.

Долго среди жен кустарей не велась работа. Но, вот, настал праздник и на нашей улице. Женотделом было созвано наше первое собрание, которое послужило началом для дальнейшей работы.

Сейчас активность наша с каждым днем растет. Мы организовали газетный кружок, который посещают вместо 10 чел.—20 чел. Читаем журнал „Беларуская работніца і сялянка“, который нас очень интересует. 10 октября у нас были выборы делегаток. Надеемся, что дальше работа пойдет еще лучше. Мы поняли теперь, что только сама женщина должна строить свою новую жизнь.

От жен быховских
кустарей **Х. Хавкина.**

# З ЖЫЦЬЦЯ СЯЛЯНКІ

## Настаўніцы, бярэце прыклад.

*(Сураскі раён, Віцебскай акругі).*

Аднэй з перадавых настаўніц раёну, моцнай, вытрыманай і адданай грамадзкай працы з'яўляецца тав. *Высоцкая.*

Яна працуе сярод сялянак з 1924 году, замужняя, падала заяву аб уступленьні ў партыю. Сярод сялянак працуе не за страх, а за сумленьне і карыстаецца ў іх вялікай пашанаю. Раз у месяц тав. Высоцкая пад кіраўніцтвам ячэйкі КПБ праводзіць агульныя сходы сялянак, на якіх бывае па 120 чал. Па яе жаданьню організован куток сялянкі, дзе яны зьбіраюцца чытаць і гутарыць.

Настаўніца Высоцкая.

Куток сялянкі папоўнен повымі матэрыяламі.

У асобных вёсках тав. Высоцкая наладжвае сходы сялянак, організоўвае і праводзіць працу вакол газэт і журналаў.

Тав. Высоцкая ходзіць і па асобных хутарох, да асобных сялянак, гамоніць з імі, растлумачвае законы аб зямлі і сямейным праве. Яна зьяўляецца для сялянак добрым прыяцелем, дарадчыкам і з яе думкай лічацца.

Бяз усякага прымусу сялянкі самі прыходзяць да тав. Высоцкай вучыцца грамаце. Многія ўжо наўчыліся чытаць і пісаць і ўзяліся за журнал „Беларуская работніца і сялянка". Адна сялянка ня спыніла вучэньне нават у час палявой працы і ў цяперашні час ужо добра піша. Гэта грамадзянка Станкевіч ужо паслала сваю заметку ў журнал „Бел. раб. і сял.".

Сялянкі Князяўскага сельсавету шчыра працуюць у сельсавеце і комітэце ўзаемадапамогі,—ёсьць народная засядацельніца.

Акрамя гэтага, яны выяўляюць усякія злачынствы.

Выяўленьне розных злачынстваў вельмі не падабаецца старшыні комітэту ўзаемадапамогі тав. Булахову. Ён за гэта не заве сялянак на сходы, абгаварвае іх, нічым не дапамагае, а настаўніцы Высоцкай яго кампанія пагражае сабраць падпіску супроць яе і выжыць з школы, каб ня „муціла баб".

Але тав. Высоцкая працуе і далей.

Так пашы настаўніцы пачынаюць уцягвацца ў грамадзянскую працу і вядуць за сабой працоўную сялянку.

Няхай другія настаўніцы раўняюцца па тав. Высоцкай.

**М. М.**

---

## З такімі адносінамі далёка не заедзеш.

*(Саўхоз імя Лазойскага, Узьдзенскі раён)*

У нашым саўхозе яшчэ й цяпер мала аддаецца ўвагі жанчынам. Калі здарыцца які сход ці перавыбары, ці што другое, то жанчыну выбіраюць толькі па неабходнасьці.

— На што яе выбіраць?—кажуць некаторыя.

А жанчына, якая выбрана, бачыць, што ёй аддаецца мала ўвагі, і ня хоча хадзіць на сходы.

— Чаго я пайду, там і без мяне абыйдуцца.

Напрыклад: нядаўна выбіралі дэлегатаў на Ўсебеларускую конфэрэнцыю. Рабочком казаў, што можна выбраць ад нашага саўхозу 3-х дэлегатаў. Выбралі трох: 1 работніцу і двох работнікаў. Але потым выявілася, што можна выбіраць толькі двух. Перавыбіраць ня сталі, а парашылі паслаць адну жанчыну і аднаго работніка. Невядома, як гэта зрабілася, а паслалі толькі двох мужчын.

— На што ей ехаць? Няхай лепш дома сядзіць, з дзецьмі забаўляецца.

А гэта вельмі кепска. Жанчына лепш магла-б растлумачыць жанчынам аб конфэрэнцыі.

**Дзядзька Вавіла.**

**Сялянка! Комуністычная партыя заклікае працоўныя масы сялянак да будаўніцтва нашай дзяржавы.**

# Дэлегатка дапамагае зьнішчаць злачынствы.

*(Вёска Калмак, Чавускі раён).*

Быў у вёсцы Калмак, Чавускага раёну, старшыня сельсавету Мікалаенкаў. Карыстаючыся сваім старшынствам, Мікалаенкаў шмат гадоў укрываў сваю скаціну ад учоту і дапамагаў рабіць гэта сваім блізкім знаёмым.

Але вось у 1924 годзе выбралі ў нас дэлегатак, у склад якіх увашла і сялянка Рабцова Ганна. Бачыць Рабцова злачынствы старшыні. Трывожыць гэта яе. І вось, у час перавыбараў яна дае старшыні адвод і яго не праводзяць.

Летам 1925 году яна заўважвае, што Мікалаенкаў і другія грамадзяне зноў хаваюць скаціну ад учоту. Рабцова заявіла аб гэтым у Райвыканком.

Узьненавідзела тады гэта „кумпанія“ Рабцову. Пачынаюцца праследаваньні. Укрывацелі скаціны не застанаўліваюцца і перад пабоямі.

Цяжка працаваць Рабцовай. Не знаходзіць яна ў сваёй вёсцы абароны. Сакратар сельсавету кажа:

— Вельмі-ж ужо Рабцова ў справы сельсавету ўмешваецца.

Але не такая Рабцова, каб застанавіцца перад пагрозамі. Яна спадзяецца на абарону і дапамогу з боку Савецкай улады.

І яна не памылілася. Савецкая ўлада, савецкія законы заўсёды абароняць сялянку-дэлегатку.

Меры к гэтаму ўжо прыняты.

**Збароўская.**

## Сялянка змагаецца з п'янствам.

*(Каралінскі раён, Мазырскля акру а).*

10-га кастрычніка ў канцэлярыю Раённага Комітэту Партыі зьявілася дэлегатка-сялянка і паведаміла сакратара райкому, што недалёка ад мястэчка месныя грамадзяне займаюцца гнаньнём самагонкі. Аб гэтым была паведамлена міліцыі. Неўзабаве на дварэ міліцыі можна было бачыць: апарат, бочкі, вёдры й іншыя прылады самагоншчыкаў.

Так сялянка змагаецца з вялікім ворагам п'янствам.

**Р. Палянская.**

## Мужчыны ня пускаюць на сходы.

*(Мястэчка Росіца., Полацкая акруга).*

Мы вельмі рады, што нам, цёмным сялянкам, даюць веды, вучаць нас. А гэта навука нам вельмі патрэбна.

Сабралі мы з поля збожжа, а цяпер пачнём вучыцца.

Адно кепска ў нас: мужы ня пускаюць жанчын на сходы і б'юць іх часамі. Наогул глядзяць на жанчыну як і даўней.

Трэба павесьці працу і растлумачыць мужчынам, што жанчына такі самы роўнапраўны будаўнік нашай рэспублікі, як і мужчына.

**Бачыўшая.**



Сялянкі за хатняй працай.

Общественницы Белыничского сельсовета.

## Жаночы аддзел, зьвярні ўвагу.

*(Вёска Данілавічы, Койданаўскі раён).*

Вёска Данілавічы знаходзіцца за 20 вёрст ад мястэчка Койданава і за 35 вёрст ад Менску. Гэта самая закінутая, самая забытая вёска. За ўвесь час існаваньня Савецкай улады жаночых сходаў амаль што ня было.

Праца сярод кабет не вядзецца. У вёсцы захаваліся старыя звычаі і забабоны. Сялянкі моцна вераць у розных знахароў, знахарак, шаптуноў і да іх заўсёды зьвяртаюцца за дапамогаю пры няшчасных здарэньнях.

Тут патрэбна праца і нават вялікая барацьба з цемраю, спадчынаю царызму. Пакуль што гэта праца і гэтае змаганьне не вядзецца. Ёсьць там старая настаўніца, але яна гэтай працы не вядзе, яна і сама больш усяго займаецца беспатрэбнымі плёткамі і рознымі зводамі.

Ужо даўно пара заняцца працаю змаганьня з цемрай сярод жанчын вёскі Данілавічы.

Лечацца кабеты больш ўсяго ў вясковых лякарак-бабак, каторыя губяць і калечаць людзей. Сказаць праўду, і мэдыцынская дапамога ў гэтай вёсцы слабая. Трэба, каб жаноддзел распачаў працу сярод цёмных і неорганізованых жанчын гэтае вёскі.

**Селькор.**

## Няграматных жанчын у нас ня будзе.

*(В. Верхмень, Смалявіцкага раёну, Менскай акругі).*

У нашай вёсцы, а таксама і ў другіх вёсках нашага сельсавету значны лік няпісьменных мужчын, а яшчэ больш жанчын. Шкоду гэтага ворага—няпісьменнасьці—мы, жанчыны в. Верхменя, зразумелі, дзякуючы ўсім тым гутаркам, якія часта вяліся ў нашай хаце-чытальні і школе. Доўга, пад уплывам мужчынскага сьмеху, мы сароміліся пайці ў школу. Заслонку сораму вялікім „учыцца" нашы жанчыны скінулі ў сакавіку г. г., калі ў ліку 21 асобы пашлі ў школу вучыцца. Працавалі шчыра, і вынікам гэтае працы зьявілася магчымасьць убачыць, што мы можам навучыцца грамаце.

4 кабеты атрымалі пасьведчаньні аб тым, што скончылі школу ліквідацыі няграматнасьці. Цяперь яны нават пішуць у насьценную газэту. Такім чынам праз ліквідацыю няграматнасьці мы зможам зьнішчыць цемру, якая доўгія годы мучыла нас. **Вясковая.**

## Собрание крестьянок к приезду РИКа.

Риком разобрано 18 писем и 14 личных заявлений крестьянок.

## Балючае пытаньне.

(*Капаткевічы, Петрыкаўскага раёну*).

Пры працы сярод дэлегатак-сялянак даводзіцца сустракацца з многімі перашкодамі. Хоць за гэты год нам удалося, праўда малы проц., уцягнуць ўва ўсе галіны працы на вёсцы, але дрэнна тое, што тыя організацыі, куды яны выдзелены працаваць, застаюцца бязьдзейнымі. Спынюся, галоўным чынам, на вёсцы Айлічскай Рудні, Петрыкаўскага раёну. Маюцца там дэлегаткі і ў сельсавеце і ў комітэце ўзаемадапамогі, у школьным савеце і г. д. Калі я запыталася ў дэлегаткі, які яна ўдзел прымае ў сельсавеце, яна адказала, што там ні разу ня было пасяджэньня. Справа гэтак сама ідзе і ў другіх організацыях. Зразумела, што пры гэтакім становішчы працы, нашы дэлегаткі ня змогуць выявіць сябе. Возьмем другую бліжэйшую вёску—Аголічы. Там сялянкі жаляцца на тое, што пры якіх-небудзь выбарах, калі сялянкі выстаўляюць кандыдатуру якой-небудзь жанчыны, то мужчыны не згаджаюцца і кажуць, што ня ёй там быць.

Неабходна такія выпады зьніштожыць і павесьці няшчадную барацьбу з тою часткаю насяленьня, якая тармозіць нашу працу і не дае магчымасьці сялянкам паказаць сваю здольнасьць у гэтай працы. К вялікай нашай радасьці мы заўважылі, што сялянкі самі хочуць прымаць удзел у будоўлі нашага жыцьця, самі зачэпліваюць важныя пытаньні жыцьця.

Уявеце сабе, што калі гадоў 2-3 назад было паднята ў вёсцы пытаньне аб адчыненьні ясьляў, то сялянкі і слухаць аб іх не хацелі, а цяпер яны самі вымагаюць, каб у іх адкрылі ясьлі.

У вёсцы Аголіч. Рудні нядаўна на сходзе сялянак яны самі паднялі пытаньне аб тым, што згаджаюцца на свой кошт адкрыць яслі, абы гасударства пашло насустрач і дало кіраўніцу.

Наогул можна сказаць, што нашы сялянкі пачалі прачынацца, асазнаваць абкружаючае іх жыцьцё.

Неабходна толькі ўдзяліць больш увагі і чуласьці да іх жыцьцёвых запытаньняў, спыняцца на кожным зробленным імі ўперад кроку.

І толькі гэтакім шляхам мы зможам перае магчы несьвядомасьць нашых сялянак і выкаваць з іх сьвядомых будаўнікоў Савецкаўлады.

**Гарэлік Б.**

## Прамень сьвету ў цёмным кутку Мазыршчыны.

Будучы ў вёсцы Бібацькі, Пятрыкоўскага раёну, Мазырскай акругі, я знаёмілася з жыцьцём сялянак.

Што робіцца ў іх цяпер, то гэта я бачыла сама, а што рабілася раней, дык мне расказалі дэлегаткі гэтай вёскі з настаўніцай.

Раней у гэтай вёсцы, расказвалі дэлегаткі, амаль што ўсе былі няпісьменныя, калі й былі пісьменныя, то толькі мужчыны, дый то 2 альбо 3 на ўсю вёску, а жанчыны нават і ня зналі, што гэта за пісьменнасьць.

Толькі ў 1923 годзе ў Бібацькі зазірнулі праменьні сьвету.

Школа ў Бібацьках адчынілася ў 1921 год., але карысьці ад яе было мала, бо бандыты перашкаджалі весьці працу. Толькі ў 1923 годзе, калі ў вёску прыехала актыўная настаўніца, праца пачала ажываць. Яна ўсякім чынам старалася ўцягнуць у школу ўсіх няграматных. Калі пачаліся заняткі ў школе, то апошнюю наведвалі толькі хлопцы, а дзяўчатак ня было. Сяляне казалі: „Дзяўчына ў маскалі ня пойдзе, ёй і пісьменнасьць нятрэба."

Бачачы такія справы, настаўніца пачала заклікаць дзяўчат да школы другім чынам. Яна апавясьціла, што ўсіх дзяўчат, ходзячых у школу, будзе вучыць рукадзельлю. На гэта некаторыя жанчыны пазайздросьцілі і пачалі пасылаць да школы сваіх дачок вучыцца ня так пісьменнасьці, як рукадзельлю. Дзякуючы такому падыходу, удалося завабіць у школу некалькіх дзяўчат, лік каторых рос з кожным тыднем. Каб прыцягнуць у школу ўсіх сялян, настаўніца пачала выпісваць часопісі і газэты і рабіць чытанкі, якія канчаліся заўсёды доўгімі тлумачэньнямі. Сяляне згадзіліся, што няпісьменны чалавек—гэта ўсё роўна, што сьляпы. Сялянкі пачалі пасылаць у школу дачок.

Пасылаюць бацькі да школы і вялікіх хлапцоў, і дзяўчат зьнішчаць сваю няграматнасьць. Толькі старыя, якія ня маюць часу за працаю па гаспадарцы, ня ходзяць вучыцца. Яны займаюцца чытаньнем кніжак вечарамі.

Цяпер кожнае сьвята ў школе шмат сялянства: яны знаходзяць тут адпачынак ад працы.

Прысутнічаючы на аднэй з іх чытанак, я была рада за вялікія дасягненьні нашых вёсак, асабліва вёскі Бібацькі. Я добра знаю, што раней яны зусім не хацелі наведваць школу, яны лічылі гэта сорамам. Першымі прышлі да школы дэлегаткі і, выслухаўшы адну-дзьве чытанкі, зразумелі, што наведваць школу няма ніякага сораму, а толькі вялікая карысьць. Тагды па прыкладзе дэлегатак пашлі на чытанкі ўсе жанчыны.

Цяпер сяляне гэтай вёскі радасна чакаюць спэктакляў і нават пасылаюць сваіх дзяцей у тэатры ўякасьці артыстых, у той час як раней яны ня чулі, што гэта за тэатр і што за артысты. Адным словам, вёскі не пазнаць. Вось што значыць мець школу з актыўным настаўнікам.

**Селькорка.**

---

## 1-я раённая конфэрэнцыя дзяўчат.

*(Узьдзенскі раён).*

Нядаўна адбылася першая раённая конфэрэнцыя дзяўчат. Дэлегаткамі на конфэрэнцыю сабралася шмат вясковых дзяўчат. Прывітаць першую раённую конфэрэнцыю дзяўчат выступалі прадстаўнікі райкому КПБ, райкому ЛКСМБ і прадстаўніцы жанаддзелу, якія падкрэсьлілі, што Савецкая ўлада стараецца выцягнуць кабету з цемры й заняпаду і прывучыць яе да грамадзянскай працы, уцягнуць у жыцьцё і наша савецкае будаўніцтва.

Далей былі зроблены два даклады: 1) Становішча жанчыны ў Савецкім саюзе і 2) Дзяўчына й комсамол. Гэтымі дакладамі сялянскія дзяўчаты былі пазнаёмлены з тымі задачамі, з тэй роляй, якую яны павінны выпаўняць у цяперашні час.

Тыя дзяўчаты-дэлегаткі, якія першы раз былі на раённай конфэрэнцыі, засталіся здаволенымі і выказалі сваю гатоўнасьць у далейшым наведваць ўсе жаночыя сходы-конфэрэнцыіі, таксама і усе іншыя сходы.

Сялянскія дзяўчаты ў першы раз на конфэрэнцыі вялі сябе ня зусім сьмела. Пытаньняў задавалі мала і ў спрэчках выступалі таксама мала. Гэта гаворыць за тое, што ў далейшым трэба яшчэ больш уцягаваць у працу вясковых дзяўчат.

Пасьля сканчэньня конфэрэнцыі дэлегаткам быў дадзены дармовы полудзень, а ўвечары спэцыяльна для дэлегатак конфэрэнцыі пастаўлен быў дармовы спэктакль. Дзяўчаты засталіся здавольненымі.

---



# АД СТАРАЙ ДА НОВАЙ ВЁСКІ.

## І нашы вырабы маюць цану.

*(Дрысенскі раён, Полацкая акруга).*

Выстаўка ў нашым раёне прашла вельмі добра. Асабліва важна, што на выстаўцы было шмат сялянак.

На выстаўцы былі паказаны вырабы жанчын-сялянак. Усяго было 230 экспонатаў і ўсе вельмі цікавыя. Шмат сялянак атрымала прэмію па 3—5 рублі.

Атрымаўшы прэмію сялянкі казалі: „Глядзі, і нашы вырабы пашлі ўгару".

**Лісава.**

## Сялянка атрымала прэмію.

*(Сураскі раён).*

Вось наша выстаўка ў Дзень Ураджаю. Усюды відаць праца і клопаты сялянкі.

Радамі выстаўлены буйныя, сакавітыя качаны капусты, нябывалай велічыні гарбузы, моркаў і г. д.

Тут-жа паказана вельмі добрае яблыкавае павідла, якое выдумала сялянка Калініна. Варыцца яно вельмі доўга, бяз цукру, пакуль ня выварыцца ўвесь сок і застанецца густая каша, сьветлая на від і жаўтавая, на смак салодкая, пахучая,— чуць, чуць аддае пахам мёду. Можна ўжываць з чаем замест цукру, варэньня. Можна есьці з хлебам і г. д.

Гэткім чынам здабываецца дзяшовы і смачны продукт, яблыкі ня йдуць на рынак за няма што, а ў выглядзе павідла добра захоўваюцца.

Сялянка Калініна за сваю працу атрымала ўзнагароду.

**А. Блюм.**

## Сельска-гаспадарчая выстаўка ў Койданаве.

14-га кастрычніка ў м. Койданаве ў Дзень Ураджаю была наладжана выстаўка. У гэты дзень падлічваліся дасягненьні нашай сялянскай гаспадаркі, якая нашмат вырасла паводлуг мінулага году.

На выстаўцы было відаць, што ў нашым раёне ёсьць перадавыя сяляне, якія паказалі свае дасягненьні і тыя шляхі, якімі яны дабіліся гэтых дасягненьняў. Трэба сказаць, што па гэтым шляху яшчэ ня ўсе сяляне пашлі. Ня ўсе яшчэ зразумелі і сваіх ворагаў. Гэтыя ворагі ёсьць наша некультурнасьць і наша цемра.

Трэба адзначыць яшчэ й тое, што на выстаўцы прымалі ўдзел і жанчыны, якія паказвалі здабытыя імі гародныя расьліны і інш. экспонаты сваіх рук. Відаць было, што яны зьяўляюцца будаўнікамі лепшага жыцьця ў сялянскай гаспадарцы.

Дык няхай-жа жыве Сьвята Ўраджаю, якое павінна стаць вялікім днём сялянскага сьвята, якое дае магчымасьць узмацаваць і палепшыць гаспадарку і адбудаваць новую культурную заможную вёску.

Дэлегатка **Руткоўская.**

## НА ВЫСТАЎЦЫ.

Лепшыя гаспадары Койданаўскага р. паказваюць свой ураджай.

# Сельска-гаспадарчая выстаўка ў Касьцюковіцкім раёне.

*(Калінінская акруга).*

У канцы Ленінскай вуліцы прыгожа раскінулася першая раённая сельска-гаспадарчая выстаўка.

На выстаўцы правільна былі расстаўлены і разложаны экспонаты. Адзін рад быў поўны скаціны, далей гародныя і с.-г. прылады.

Цікавей усяго быў пабудован куток сялянкі, які сваёй прыгожасьцю цікавіў усіх сялян, быўшых на выстаўцы. У гэтым кутку былі вырабы сялянак, напрыклад: хусткі, коўдры, сукны, палотны, абрусы і рушнікі.

Але цікавей усяго было глядзець, як адна дэлегатка (сялянка) 39 гадоў паставіла кросны і ткала на іх палатно з прыгожымі ўзорамі.

Чуваць было паміж сялянак: „Глядзі, гэта-ж наша Гапка працуе. Здаецца, не гарадзкая, а наша сялянка, і сьвята не паважае, працуе ў нядзелю. Альбо яна працуе за грошы?“

Пачула гэта Гапка дый кажа: „Эй, бабы, вы, бабы! хіба я працую за грошы? Я працую для сваіх сялянак, як у школе настаўнікі для дзяцей. Гэтым самым я дапамагаю працаваць не старым паном, а сваёй роднай уладзе“.

**Банькова М.**

(Апавяданьне).

Значыцца, так-то, дзеткі. Зьбірайцеся ў гурток, ды бліжэй... А ты, Міхасік, кінь наярваць. Гармонік—плёвая справа, тут паважнейшыя рэчы.

Раскажу я вам усё папарадку, чыста вылажу, і за што мы змагаліся, і за што галаву клалі.

А як бывала тугавата, наконт яды тае, раменьчыкі падцягнем, ды па хатах.

— Бабка, давай малака.

— А мой ты, родненькі, змарыўся ўвесь. Твару ня відаць. Вы, што, чырвонымі будзеце?

— Так, бабулька, у чырвоных—вам абарона.

— Вось жа гэта, мілы. Белыя паскудзяць. Па лясох цягаюцца, скацінку апошнюю забралі.

— Ты, бабка, не марудзь, а за ядой ідзі. Што тычыцца грашовага пытаньня, рэзолюцыю паложым—заплацім.

— Якая там лізалюцыя. Еж, сынок, наздароўе.

Вось так цягаемся з хаты ў хату. Да вечара жывот, што твой паравоз надуецца. Ляжыш на сене ды паглядваеш.

Жывот ня дурань, спорны—на нядзелю запас.

— А хадзілі мы, хлопцы, эх, ня тое, што цяпер. Адна нага ў лапаць абута, а другая—у вапоркі. На плячох—кашуля на швох матаецца.

А быў у нас камандзер. Ды што там камандзёр—душа хлопец, тылу ня прызнаваў, заўсёды наперад любіў. У бойцы, як леў, біўся, і ніякая куля яго не бярэ.

— Якая там лізалюцыя. Еж, сынок, на здароўе.

Што тычыцца на прывале—разам еў. Калі ёсьць—давай, а не—і так добра. Пачне хто бедаваць, камандзер адразу:

— Ты што, думаеш—гэта так сабе? Не, брат, пацярпі, а каб лягчэй было, дзяжку на жывот тужэй—і гайда.

Ня любіў ён хлапцоў, што на храп бяруць. На такія справы Хведар Лапаць майстрам быў.

Прыдзе ў хату, ногі перакіне так фасоніста, па стале бізуном ды крычыць.

— Ты, бабка, савецкую ўладу падтрымоўваеш?

— Падтрымоўваю.

— Рэволюцыя ў небясьпечнасьці.

— У небясьпечнасьці.

— Дык і жывот мой у небясьпечнасьці

— Цягні на стол усё. Парасяці няма, дык курыцу; курыцы няма, дык гуся. Адным словам, даёш, бабка, і баста.

Выкліча камандзер Лапця, пратрымае яго з часок, наганяй дасьць так, што Лапаць бураком глядзіць.

Аднаго разу нават пры ўсіх журыў:

— Лапаць, ня ведаеш ці што? Не да твару ваяку-грамадзяніну ў сялян апошняе забіраць.

Дадуць—еш, не дадуць—дык так жыві. А мне—каб гэтага ня было.

Хведар Лапаць у адказ вымаўляе:

— Я... тав... камандзер.. рэволюцыя... Я і ўсякае стварэньне есьці просяць. А так, калі ўжо вельмі няможна, дык ня буду, прабачайце, тав. камандзер.

На гэтым канец да другога прывалу.

Любілі мы свайго камандзера Сафонава ды паважалі. Клопаты ў яго былі прыкладныя. Людзей сьпярша ўблагатворыць, а потым сам.

Але загінуў наш камандзер, калі куля ў баі не ўзяла, дык ад сволачы загінуў. Загінуў за тое, за што галаву клалі, аб гэтым і апавяданьне зараз вось вылажу.

II.

Была гарачая пара. У Маскве Кастрычнік спраўлялі, а ў нас баі ды баі,—з сілы выбіліся. Дэнікін так і прэ—нам адступаць загадалі.

Цягаліся мы па палёх, лясох, шмат нашых хлопцаў загінула. Не па сіле стала. Пашлі ў тыл папаўненьне браць.

Сядзім мы гэтак у тылу, у вёсцы Мамонава, ды раны падлічваем. Дзень, другі, трэці, а папаўненьня ўсё няма.

Хлопцы—камандзеру жаліцца.

— Што вы нас, тав. камандзер, крыўдзіце? Людзі на фронце галаву кладуць, за рэволюцыю мучацца, а мы, злажыўшы рукі, сядзім.

А камандзер сьмяецца.

— Што запелі? Так-бы даўно. Самому ахвота белыя скабы палічыць, вось загаду чакаю...

І вось прыбег да нас, неяк раніцай, Базыль Клім.

— Хлопцы, лафа—справа. Папаўненьне йдзе. Бачыш, на дарозе заварачваюць. Шапка мая іржой пакрылася, цяпер пачысьцім.

І сапраўды папаўненьне прыбыло.

А папаўненьне, вядома, якая справа. Бязвусыя, на грудзях—значкі,—камольцы, кажуць.

Прынялі мы іх, як і трэба. Па хатах разьмясьцілі. А Базыль Клім навучаць аднаго бязвусага сабраўся.

— Ты,—кажа,—шаблю трымаеш, а абходзіцца з ёй умееш?

Той хацеў сказаць, дык Базыль перабіў.

— Скажаш—знаеш; няпраўда твая. Выхваціў шаблю.

— Вось, глядзі, як: налева направа рубі!

— Промаху не павінна быць, а то галаву страціш.

А самае, што ня ёсьць галоўнае,—у папаўненьні адзін хлопец красаўцам быў, рыхт у рыхт, як баба. Адно сумлявалася: як гэта так, у штанох? Значыцца—ня баба.

Прышлося мне, братцы, з ім на аднэй кватэры стаяць. Думаю, вечарам пазнаю, разьдзявацца ня трэба.

Сяджу за сталом, і ён сядзіць. Ён кніжку чытае, а я мух ганяю. Сяджу час, другі, надаела. І прама да яго.

— Чаму спаць ня йдзеш?

Прабарматаў мне ў адказ—ня хочацца. Так і не даведаўся.

Раніцой у хаце маёй хлопцаў поўна,—пабачыць прышлі.

— Ня трусіць, хлопцы,—а сама—к кулямёту.

Як гэта так, баба ды ў штанох.

А Хведар Лапаць адчаканіў:

— Калі баба, дык толку ніякага. Куды ёй ваяваць, клопату толькі. Сядзела-б на печы, ды ня рыпалася. Баб'я справа—гаршкі ды яду варыць, а тут табе ваяка.

Яшчэ доўга талкавалі хлопцы. Як гэта так, у штанох.

Увашоў гэты самы, аб кім гутарка ішла. Заціхлі.

— Вы што, хлопцы, сып у кучу. Пагамонім ці што?

Тут Базыль Клім асьмеліўся, выпаліў:

— Ніяк ня ўцямім, баба ты ці не?

— Што вы, хлопцы, калі баба, дык што?

— Штаноў не палагаецца, спадніца па штату паложана,—прамовіў Хведар Лапаць.

— Нічога, і без спадніцы абойдземся. Так што, калі туга будзе, таксама ў крыўду ня дам.

— Вядомая справа, верым. Але ўсё гэта справа ня бабская. А што, калі прыпруць горача. Баба—стварэньне натуральнае, ня вытрымае.

— Ты, прыяцель мой, ня турбуйся, цябе прасіць ня буду.

Раззлавалася тут Манька ў штанох (так яе ахрысьцілі). Пенай пырскае ды к Лапцю.

— Ты ў мяне глядзі, за сабой лепш глядзі.

Ахнулі хлопцы. А ў Хведара Лапця ад такіх прамоў язык адабрала. Выручыў усіх нас з нялоўкага становішча камандзер. Ўвашоў у хату.

— Вы што тут абгаварваеце?

— Таварыш камандзер, як гэта ў штанох?

— А што ты, без штаноў хацеў? Ну, хлопцы, вестачку прынёс. Сягоньня рыхтавацца, заўтра выступаем, даволі сядзець.

III.

Зноў у бойках. Сьнедаем, палуднуем, вячэраем абавязкова з сьвінцом.

Манька, дык заўсёды ў першай лініі. Сядзіць каля кулямёта ды адклёўваецца. Сьмяецца—дзесятая лента на сходзе.

І строчыць, і строчыць. Баба, а б'ецца, любога за пояс заткне.

Дык вось, хлопцы, як камандзер наш загінуў.

Праўду кажучы, ні за што загінуў. Сволач загубіла.

Пагналі мы белых, а самі—на прывал у вёсцы, адрыхнуць крышку.

Разьлягліся, як мае быць. Выставілі варту. Белыя ў ваколіцах яшчэ шляліся, загэтым без аховы нельга.

Хведара Лапця на галоўны пост начальнікам назначылі, бо ён стары, а папаўненьне ўсё бязвусае.

Ну, і ночка выпала. Макрата, гразь па калені.

Дожджык, ды такі ёмкі, так і сыпле.

Хведар Лапаць і ўзад, і ўперад ходзіць свой пункт аглядае. Прахадзіў так з час, сухога месца на ім няма. Дрыжыць, мерзьне дык кажа:

— Чаго я тут ня бачыў? Хто ў такую пагоду пойдзе?

— Добры гаспадар сабаку ня выганіць. Давай, закурну ды падшамаю крышкі, ніхто й ведаць ня будзе.

А дождж, як назлосьць, льле і льле.

Пашоў Хведар у хату, захрапеў—і памінай як звалі.

Праз два часы па вёсцы пальба.

Адкуль? Выскачыў я з хаты.

На вуліцы ўсе ў кучу зьбіліся, дрыжаць і шэпчуць адзін аднаму.

Белыя ў вёсцы... наступаюць...

Прыбег камандзер, а з ім і Манька,

— Хлопцы, нас прадалі! На варту напалі. Ніякай панікі. Усе—на сваё месца і слухаць маю каманду,—пракрычаў камандзер.

Рассыпаліся ў рады і давай сыпаць. А белыя ўсё пруць.

Узмятнуў наш камандзер кучаравай галавой, бяжыць наперад,—і мы—за ім.

Не памятаю, братцы, што за ноч была. Толькі ведаю,—ноч была страшэнная. Біліся моцна.

Да раніцы адагналі белапагоньнікаў. Яны аддыхаюць, і мы аддыхаем.

Аглянуліся на свае рады—парадзелі вельмі, а самае важнае—камандзера-то нашага, усімі намі любімага, з намі няма

Узяў тут нас страх і няпэўнасьць.

Як без камандзера быць?

Выходзіць Манька на сярэдзіну.

— Іду туды, знайду яго.

— Што ты, Манька, на пэўную сьмерць ідзеш—пад самыя кулі.

Адгаварвалі доўга, а яна—хоць бы што. Іду й кончана.

Ня ўтрымалі—так і пайшла. Паўзком, паўзком да белых.

* * *

Праз поўгадзіны бачым—паўзе наша Манька, а на плячах—камандзер.

Белыя заўважылі—страляць пачалі. Сэрца ў нас не на месцы. Думаем, вось-вось і ўгодзіць, а яна ў бок.

Прыцягнула, а ў самой з рук кроў сочыцца.

Толькі камандзер наш быў мёртвым. Апусьцілі галавы хлопцы, насы павесілі.

А белыя зноў у бойку лезуць. Перапалохаліся мы зусім. Думаем вінтоўкі кідаць, камандзера няма, што рабіць.

Праз поўгадзіны бачым—паўзе наша Манька, а на плячох камандзер.

Тут Манька голасам слабым крыкнула:

— Ня трусіць, хлопцы,—а сама—к кулямёту.

Убачылі, што баба ня струсіла, а мы дык трусамі сталіся. Стыдна стала.

Загарэлася пажарам у нас у сярэдзіне—і давай шпарыць, і давай шпарыць.

Ня вытрымалі белыя, пяткі мажуць. А Манька каля кулямёту апошнюю ленту закладае. Уся кроўю сьцякла, каб не падасьпелі з дапамогай—уся-б вышла.

* * *

Віноўнік усяму гэтаму па сваей цемнаце быў, вядома, Хведар Лапаць. Гэта-ж ня жарт, пост пакідаць. Праўда, за гэта падзякі не далі.

А наагул, дзеткі, баба выратавала.
А пасьля, калі пыталі:
— Чаму Манька ў шганох?—
Хтосьці ў поўголаса:
— Рэволюцыя апранула.

**Н. Карабкоў.**

## Дни веселья ясные.

*(Частушки).*

Нынче праздник Октября
Вьются флаги красные
Что-то радостно с утра
В дни веселья, ясные.

По деревне бабий смех
Песни да гармоника
Охмелила радость всех
Но попробуй, тронь-ка!

День за днем бегут года
Нити жизни тянутся,
Слезы, муки и беда
Позади останутся.

Слышь, Катюша, восемь лет
Наши пролетарские
Протоптали горький след
В дни былые, царские.

Песни, праздник, знамена
Нынче вьются алые,
Изменились времена—
Не сравнить бывалые.

Раньше праздник,—в церкви звон
Пьянство, драки жаркие
Надоел нам вид икон,
Запылали яркие.

Раньше ныла голова
От побоев мужьиных
Наши женские слова
Никому не нужные.

А теперь за восемь лет,
Как все изменилося,
Женотдел и сельсовет
За нас заступилися.

Слышь, Катюша, мой совет:
В клубе много знаний,
Не читала ты газет—
Сходи на собрание

Нынче праздник Октября,
Вьются флаги красные,
Даже пляшет детвора—
Песенки прекрасные.

**Гришка Ладный.**

## Селькорка.

Тридцать лет, как в потемках ходила,
Не умела читать и писать,
На господ, на поповское рыло—
Много силы пришлось измотать.
В позапрошлом году Катерине
„Ликвидация“ живо далась,
Изменилася сразу картина
Для ее прозревающих глаз.
В Минске—городе в нашей столице—
Брат Василий кончает рабфак.
—Не молчи, дорогая сестрица,
А пиши обо всем, что и как.
Пропечатывать буду в газете,—
О неладном и ладном, давай.
Про порядки в читальне, в совете.
Про кулацкие шашни у вас.

И с тех пор, Катерина, в неделю
По письму отправляет в журнал.
—„Вот ехида, вот вредное зелье.
Что ей дела, как кто проживал.
Кулаки самогонку варили,
И село подпалили на смех.
Взяло за-сердце тут Катерину,—
Прописала об этом в письме.
Катеринин портрет поместили
В газете, на первом листе.
Девки, бабы ее захвалили,
С ней советывалися затем.
Девок, баб в БССР миллионы.
Не молчите, берите перо!
И тогда не посмеют вас тронуть,
Не посмеют грозить топором!

**А.**

# ДЕТСКИЕ ЯСЛИ И ПЛОЩАДКИ.

## Працы летніх вясковых ясьляў.

*(Калінінскае вакругі).*

У палове верасьня зачыніліся летнія ясьлі па нашай акрузе. Існавалі яны ў 6 пунктах 4 вёсках і дзьвёх комунах. Ахоплівалі больш 60 дзяцей і толькі ў аднэй комуне працавалі дрэнна. Сьмертнасьці дзяцей у ясьлях ня было. Балелі дзеці толькі ў першыя часы існаваньня ясьляў.

З маткамі сялянкамі вяліся бяседы, і яны атрымалі шмат ведаў па выхаваньню дзіцяці, таксама напрыкладзе працы саміх ясьляў яны бачылі, як трэба выхоўваць дзяцей. Колектывізм прывіўся к маленькім дзецям ясьляў. Нярэдка маткі дзівіліся і гаварылі: „Што не дасі дзяцёнку, усё ў ясьлі цягне, каб падзяліцца з таварышамі".

Амаль-што ва ўсіх ясьлях дзеці, нават самыя маленькія, навучыліся сьпяваць беларускую марсэльезу. Прыемна слухаць, як двох-трох-гадовыя дзеці зычна з натхненьнем сьпяваюць: „Ад веку мы спалі". Трэба адзначыць, што ў ясьлях дзеці сустракалі добрыя матчыя адносіны з боку пэрсоналю ясьляў. На сялянскім сходзе ў вёсцы Мазалава адна сялянка мне казала: Я раней ня думала, што можна кахаць, чужое дзіцё, як сваё, але-ж, як адчынілі у нас у вёсцы ясьлі, я гэтае бачу на прыкладзе".

Матэрыяльныя ўмовы ясьляў былі ня зусім добрыя: на кармленьне дзяцей было адпушчана мала грошай; але-ж нашыя загадчыцы экономныя гаспадыні—на 15 кап. у дзень кармілі дзяцей 4 разы. Прыходзілася мне запытваць у дзяцей: „Дзе ляпей жывецца: у дварэ ці ў ясьлях", і хлопчык мне адказаў на гэтае: „У ясьлях ляпей"; а калі далей запытала: „Чаму ляпей", ён мне адказаў: „У дварэ матка сварыцца і ня смачна есца".

Я лічу, што галоўным дасягненьнем працы вясковых ясьляў нашай акругі зьяўляецца тое, што яны адчынілі перад вачыма сялян хоць маленькі кавалак навога быту. Яны паказалі сялянцы, якая карысьць ёсьць у колектыўным жыцьці.

**Высоцкая.**

## Наши достижения.

*(Чашники).*

В нашем темном, бедном районе появились „Красные вестники" раскрепощения крестьянки: 1 детская летняя площадка и дет. ясли. Первая открыта на средства кооперации и шефа и обслуживает 25-30 детей—разных деревень. Крестьянки очень заинтересовались площадкой и обещали приносить иногда молока, а крестьяне привозили дрова. Руководят работой две делегатки: одна школьная работница, а другая крестьянка. Выбраны две матери для ознакомления с работой.

Детские ясли открыты при коммуне „Красный Борец". Придешь туда и просто душа радуется. Ребятишки чистенькие, беленькие, довольные скачут, играют. Деревня смотрит на ясли, как на благие начинания компартии и Сов.власти.

**Кликунец.**



Пуховичский р-н. Новоселковские полевые ясли им. „Ильича".

Ясли в дер. Макаровичах, Петриковского р-на. Дети в спальне

## Вместо слез—слышен смех. *)

Хорошо сохранился графский дом. Уютные чистые комнаты, широкая веранда, около которой чинно стоят южные растения. Дом окружен красивым парком. Теперь здесь целый день неумолкаемый детский смех, топот маленьких ножек, голоса матерей. Здесь 28 июня 1925 года открылись полевые детские ясли, при совхозе „Красный Октябрь", на 30 человек. Около расположены деревни.

Утром в семь часов матери приносят своих детей. Сестра и няня сейчас же моют их и переодевают в чистое белье. Оживленно проходит детский завтрак. С большим аппетитом с'едают дети свою кашу, выпивают молоко с булкой и идут с сестрой на площадку в песок. Голенькие, освещенные солнцем, весело играют, валяются в песке. А те, которые еще не могут ходить сидят с няней около играющих детей. Время обеда. Все идут к умывальнику, моются и садятся за стол кушать свой бульон и котлету. Не помывшись дети не садятся за стол. Конечно не сразу привыкли дети к такому порядку. Дома ведь ели они грязными, не во время.

После обеда все дети идут в спальню, где чинно в ряд стоят детские кроватки с чистенькими матрасиками и простыньками.

